**НАВУКОЎЦЫ ХОДЗЯЦЬ У ШКОЛУ**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт стаў пляцоўкай для школы маладога вучонага
Стар. 2

**ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ XIII МІЖНАРОДНАЙ НАВУКОВАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ**
Адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя «Актуальныя экалагічныя праблемы» Стар. 3

**ЧЭМПІЁНСКІ ХОД: ШАШКІ ЯК ЧАСТКА ЖЫЦЦЯ**
Пра ўдзельніцу нацыянальнай зборнай Беларусі па шашках Вікторыю Нікалаеву
Стар. 4

**ПРА АРЫЯНУ, МАГІЮ І ЛЮЦІКА**
У 6 гадоў Арыяна Чарняк стала майстрам спорту і мае больш за 30 узнагарод
Стар. 5

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

27 снежня 2023 года, № 12 (2277)

## «Моладзь павінна адчуваць значнасць уласнага голасу і адказнасць за развіццё дзяржавы»

**Напярэдадні адзінага дня галасавання рэктар БДУ Андрэй Кароль расказаў пра значнасць моладзі ў жыцці дзяржавы і ініцыятывы ва ўніверсітэце, накіраваныя на фарміраванне грамадзянскай пазіцыі ў студэнтаў. Яны не толькі будучыня любой краіны, але і рухаючая сіла, якая вызначае лёс многіх пакаленняў. Таксама пра тое, як сублімаваць гэтую сілу і накіраваць яе на карысць грамадства, адказаў Андрэй Кароль.**



**Праектная дзейнасць**

Знешнепалітычная сітуацыя і глабальная перабудова свету, рост інфармацыйных тэхналогій і маніпуляванне людзьмі сёння ўказваюць на неабходнасць развіцця дасведчанасці моладзі ў галіне права, палітыкі, у інфармацыйных і электаральных пытаннях. Некампетэнтнасць у гэтых тэмах становіцца пагрозай для любой краіны. А таму нароўні з фарміраваннем прафесійных навыкаў важна прывіваць студэнтам прававую і інфармацыйную культуру. У БДУ для гэтага ёсць усе неабходныя ўмовы і рэсурсы. Профільныя факультэты, фундаментальная інтэлектуальная база юрыдычнага профілю ў спалучэнні з інавацыйнымі адукацыйнымі тэхналогіямі, якія ўкараняюцца ў вучэбны працэс, дазваляюць нам аптымізаваць навучанне і выхаванне, напоўніць гэтыя працэсы ўзаемадапаўняльным зместам.

Вялікую ролю ў адукацыі моладзі мы адводзім не толькі прававой культуры, але і праектнай дзейнасці. Студэнтам даецца магчымасць быць ініцыятарамі і рэалізатарамі мерапрыемстваў, галоўны прынцып якіх – «роўны навучае роўнага». Напрыклад, на юрыдычным факультэце сфарміравана моладзевая мабільная інфармацыйная група. Юнакі і дзяўчаты наведваюць факультэты, працуюць са школьнікамі, каб у даступнай форме данесці інфармацыю пра асноўныя палажэнні Канстытуцыі, растлумачыць прызначэнне адзінага дня галасавання. Сярод візітных картак можна адзначыць «Адзіны дзень інфармавання вачыма студэнтаў», «Кадравую лесвіцу», што праводзіцца сумесна з «Белай Руссю» і БРСМ, «Беларускі студэнцкі патрыятычны форум», «Свята Вялікай Перамогі», форум «МІР: Моладзь. Інтэграцыя. Развіццё»,«Школа маладога выбаршчыка».

**Інфармацыйная гігіена**

Мы ствараем умовы для фарміравання кампетэнцый і навыкаў інфармацыйнай гігіены праз правядзенне сустрэч студэнтаў з экспертамі, палітыкамі, прадстаўнікамі органаў улады. Вельмі важныя рэгулярныя размовы з моладдзю. Часам «нязручныя» пытанні ад студэнтаў дапамагаюць нам убачыць, чым яны занепакоеныя, ацаніць узровень іх дасведчанасці і аб'ектыўнасці ў палітычных і прававых тэмах. Дарэчы, пытанне студэнта, а не яго адказ з'яўляецца ключавым кампанентам эўрыстычнай сістэмы, якую мы эфектыўна выкарыстоўваем у БДУ. Запытанне праз пазнанне аб'ектаў навакольнага свету дазваляе навучэнцу адкрыць сябе, вызначыць свае сэнсы і мэты, выявіць і раскрыць патэнцыял. Напрыклад, з канца мінулага навучальнага года ў нас стартаваў праект «Дыялог рэктара са студэнтамі». Праз гэтую сацыяльна значную ініцыятыву імкнёмся сфарміраваць у моладзі грамадзянскую адказнасць, патрыятызм. Абмяркоўваем падзеі ў свеце і нашай краіне, выступленні і заявы нашага Прэзідэнта па пытаннях дзяржаўнага і партыйнага будаўніцтва.

**Фарміраванне лідараў**

БДУ – інтэлектуальны цэнтр па падрыхтоўцы высокапрафесійных спецыялістаў для розных сфер эканомікі, у тым ліку для ўсіх галін улады. Многія нашы выпускнікі працуюць у Адміністрацыі Прэзідэнта, Палаце прадстаўнікоў і Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Мы падтрымліваем актыўныя кантакты з гэтымі органамі. Гэта дапамагае задаволіць дзяржаўны запыт на падрыхтоўку спецыялістаў і скаардынаваць свае дзеянні ў рэалізацыі моладзевай палітыкі. Аднак гэта толькі адзін з вектараў нашага ўзаемадзеяння. Другі напрамак – прыцягненне вучоных БДУ ў якасці экспертаў і распрацоўшчыкаў законаў. Напрыклад, з 36 членаў Канстытуцыйнай камісіі, што працавала над новай рэдакцыяй Галоўнага закона Беларусі, трое – супрацоўнікі юрыдычнага факультэта.

Трэцяй формай партнёрства можна назваць прыцягненне нашай моладзі да абмеркавання законатворчых праектаў. Іх жыццядзейнасць залежыць ад актуальнасці і патрэбы ў гэтых новаўвядзеннях нашага грамадства. А ў гэтым пытанні вельмі адчувальнай аўдыторыяй выступае студэнцтва, таму важна арыентавацца на яго думку. З удзелам дэпутацкага корпуса ў БДУ праводзяцца лекцыі, семінары, адкрытыя дыялогі, дыскусійныя пляцоўкі. Гэта дапамагае моладзі лепш разумець мэтазгоднасць і змест прынятых змен і ініцыяванне новых.

Чацвёрты вектар звязаны з удзелам актывістаў універсітэта ў рабоце Моладзевага парламента Беларусі. Такая практыка дазваляе ім увайсці ў прафесійнае кіраўнічае асяроддзе, хутчэй рэагаваць на бягучы парадак дня ў краіне, разумець законы і праекты, якія прымаюцца. Дадзеная дзейнасць фарміруе лідараў меркаванняў, якія адначасова становяцца «мостам» для зваротнай сувязі па перадачы запытаў ад моладзі і транслююць ёй важныя для дзяржавы рашэнні.

Непасрэднае знаёмства студэнтаў з дзейнасцю мясцовых органаў самакіравання, парламентарызму, Мінскага Савета дэпутатаў і іншых органаў складае пяты напрамак узаемадзеяння з дэпутатамі. Гэта выдатная магчымасць убачыць спецыфіку працы дэпутатаў, задаць ім пытанні і прапанаваць свае ініцыятывы.

**Значнасць уласнага голасу**

Нагадаю, 25 лютага ў нашай краіне пройдзе адзіны дзень галасавання. Беларусы выберуць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і мясцовых саветаў дэпутатаў. Дарэчы, практыка аднамомантавых выбараў не новая і прымяняецца ў многіх краінах. Змяненне беларускай электаральнай сістэмы, безумоўна, крок наперад у развіцці грамадзянскай усвядомленасці і актыўнасці. Цяпер кожны выбаршчык зможа комплексна ўбачыць і зразумець, як выбудоўваецца палітычная і грамадска-грамадзянская вертыкаль, ацаніць узаемазалежнасць і зладжаную працу ўсіх галін улады. Акрамя таго, адзіны дзень галасавання дазволіць засяродзіць на адным працэсе ўсе палітычныя сілы ў краіне і кансалідуе грамадства для ўдзелу ў выбарчым працэсе.

Моладзь павінна адчуваць значнасць уласнага голасу і адказнасць за развіццё дзяржавы, бо яны ўжо яе частка і будучыня ў іх руках. На ўсіх сустрэчах з кіраўніцтвам БДУ студэнты задаюць пытанні пра важнасць удзелу ў выбарах і перавагі правядзення адзінага дня галасавання. Тлумачым, што новая форма мае шэраг магчымасцей. Гэта ўмацаванне і актывізацыя грамадзянскай пазіцыі насельніцтва, прыўнясенне яснасці і разумення ў выбарчы працэс, яго механізмы і складнікі, стварэнне аптымальных умоў для правядзення выбараў дэпутатаў, ад якіх будзе залежаць вырашэнне як прыватных, так і глабальных грамадска-палітычных праблем.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ і «Настаўніцкай газеты»**

---

**АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ**



Выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і мясцовых саветаў дэпутатаў з'яўляюцца вядомай усім грамадзянам Рэспублікі Беларусь формай абрання прадстаўнікоў беларускага народа ў органы заканадаўчай і мясцовай улады. Шэраг новаўвядзенняў заканадаўства, абумоўленых зменамі і дапаўненнямі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, закранулі выбары, якія адбудуцца ў 2024 годзе. У прыватнасці, гэта правядзенне выбараў у адзіны дзень галасавання, а таксама ўдакладненні патрабаванні да палітычных партый і іх перарэгістрацыя. Дадзеныя аспекты ўдасканалення заканадаўства садзейнічаюць развіццю дэталяў выбарчай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь, разам з тым сведчаць, што нацыянальны выбарчы працэс развіваецца. Разуменне кожным грамадзянінам важнасці ўдзелу ў выбарах і значнасці яго голасу для забеспячэння рэалізацыі электаральнага суверэнітэту вельмі актуальнае.

**Намеснік дэкана па выхаваўчай рабоце юрыдычнага факультэта БДУ Віктар Сухапараў**

УНІВЕРСІТЭТ
27 снежня 2023 года, № 12 (2277)

# Навукоўцы ходзяць у школу

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт стаў пляцоўкай для школы маладога вучонага*

**Першы сезон мерапрыемства, накіраванага на развіццё інтарэсу маладых людзей да навукі і падтрымку іх даследаванняў, праходзіў 13-15 снежня на базе факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі. Арганізатарамі адукацыйнага інтэнсіву выступілі саветы маладых вучоных пры Міністэрстве адукацыі і БДУ.**




Геаграфія ўдзельнікаў падзеі ахапіла сталічныя УВА, Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна, а таксама Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ефрасінні Полацкай. Колькасць маладых даследчыкаў перавысіла сто чалавек.

У першы дзень адбылося ўрачыстае адкрыццё школы маладога вучонага. Гасцямі цырымоніі сталі першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Бахановіч, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Таццяна Сталярова, акадэмік-сакратар аддзялення фізіка-тэхнічных навук НАН Беларусі Сяргей Шчарбакоў, старшыня савета маладых вучоных пры Міністэрстве адукацыі Настасся Кісялевіч і старшыня савета маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Станіслаў Юрэцкі. Удзельнікам падзеі таксама прэзентавалі дзейнасць Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў, Вышэйшай атэстацыйнай камісіі і пазнаёмілі з магчымасцямі падтрымкі адоранай моладзі.

– У свеце, дзе веды і навука становяцца драйверам развіцця грамадства, заўсёды патрэбна ствараць спрыяльныя ўмовы для выхавання новага пакалення даследчыкаў. Школа маладога вучонага – гэта ўнікальная адукацыйная прастора, што будзе служыць адпраўной кропкай для моладзі, якая імкнецца да атрымання навуковых ведаў, – заўважыла старшыня савета маладых вучоных пры Міністэрстве адукацыі Настасся Кісялевіч. – Дзякуючы школе, маладыя навукоўцы змогуць зразумець, якой павінна быць структура даследавання, як пазбегнуць непраўамерных запазычванняў, навучацца правільна прэзентаваць вынікі сваіх даследаванняў, што ў сваю чаргу зможа паспрыяць атрыманню фінансавай падтрымкі для іх рэалізацыі.

Другі «школьны» дзень пачаўся з практычных парад ад запрошаных спецыялістаў. Вучоных-пачаткоўцаў чакала 5 лекцый, прысвечаных публікацыйнай дзейнасці, менеджменту навуковай работы, некарэктным запазычваннем, моладзевым ініцыятывам у галіне міжнароднага супрацоўніцтва, а таксама заняткі па асновах інтэлектуальнай уласнасці. Выступоўцы падзяліліся з удзельнікамі прыёмамі планавання часу, дадаткамі для арганізацыі навуковай дзейнасці, акрэслілі памылкі пры напісанні і публікацыі вынікаў даследавання і інш.

Заключны дзень падзеі ўвабраў у сябе майстар-класы па прамоўніцкім майстэрстве, медыйнай пісьменнасці даследчыка, прэзентацыі навуковых вынікаў, а таксама метадалогіі і методыцы дысертацыйнага даследавання. Экспертамі выступілі выкладчыкі факультэта журналістыкі, старшыня савета маладых вучоных пры Міністэрстве адукацыі і прадстаўнік Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы.

– Хацелася б, каб вынікам нашага мерапрыемства стала стварэнне новых навуковых калектываў, павышэнне якасці і эфектыўнасці даследаванняў, а таксама далучэнне большай колькасці моладзі да навукі. Спадзяёмся, што школа стане традыцыйнай і будзе праводзіцца адзін-два разы на год у розных універсітэтах, – выказалася Настасся Кісялевіч.

**Ірына ІВАШКА**

# «Школа маладога выбаршчыка» стартавала ў БДУ

«Школа маладога выбаршчыка» стартавала 19 снежня ў БДУ. З вітальным словам выступіла прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Ганна Бакун. Яна адзначыла важнасць дадзенай ініцыятывы, якая дазволіць маладым выбаршчыкам палепшыць сваю палітычную і прававую культуру. Таксама ва ўрачыстым адкрыцці прынялі ўдзел начальнік упраўлення па выхаваўчай рабоце з моладдзю (УВРМ) Аляксей Шавель і намеснік дэкана юрыдычнага факультэта Віктар Сухапараў.

Усяго ўдзельнікамі праекта сталі каля 200 студэнтаў, якія ўпершыню прымуць удзел у выбарчым працэсе ў лютым 2024 года.

Для іх арганізуюць тры тэматычныя этапы з заняткамі. Праграма адкрылася лекцыямі і майстар-класамі на тэму «Выбарчы працэс у Рэспубліцы Беларусь». У якасці спікераў выступаюць выкладчыкі факультэтаў міжнародных адносін, журналістыкі, юрыдычнага і гістарычнага.

У студзені запланавана дыскусійная пляцоўка з удзелам дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Прадстаўнікі заканадаўчай улады распавядуць студэнтам пра выбарчае права ў нашай краіне.

Завяршальнымі заняткамі стане дзелавая гульня «Сацыяльны партрэт дэпутата як фактар уплыву на выбар выбаршчыка», якая пройдзе ў лютым наступнага года. Удзельнікі змадэлююць інтэрактыўныя выступленні кандыдатаў у дэпутаты перад электаратам, прадставяць перадвыбарную праграму і адкажуць на пытанні патэнцыйных выбаршчыкаў.

Нагадаем, праект рэалізуецца з мэтай асветы студэнцкай моладзі па тэматыцы выбарчага працэсу ў Беларусі, павышэння павышэння грамадзянскай актыўнасці і прававой культуры студэнтаў грамадзянскай актыўнасці і прававой культуры.

Арганізатарам праекта выступае УВРМ БДУ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**





# Падведзены вынікі XIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі



**Падведзены вынікі XIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі маладых навукоўцаў, студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў «Актуальныя экалагічныя праблемы».**

У МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ адбылася Міжнародная навуковая канферэнцыя «Актуальныя экалагічныя праблемы». Форум у 13-ы раз сабраў маладых навукоўцаў, студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў Беларусі, Расіі, Узбекістана, Сербіі, Турцыі і Кітая.

На канферэнцыі абмяркавалі пытанні экалогіі, звязаныя не толькі з аховай навакольнага асяроддзя, але і з распрацоўкай новых тэхналогій для даследаванняў: інфармацыйных, медыцынскіх, маніторынгавых. Некаторыя з іх разгледзелі на пленарным пасяджэнні.

Загадчык кафедры інфармацыйных тэхналогій у экалогіі і медыцыне МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ Павел Шалькевіч выступіў з дакладам «Сістэма анлайнманіторынгу стану навакольнага асяроддзя ў Оршы і Аршанскім раёне». Гэта паспяховая спроба стварыць геаграфічную інфармацыйную сістэму ў Беларусі пры дапамозе распрацоўшчыкаў.

– Было неабходна вырашыць шэраг задач. На замову Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь мы распрацавалі праграмнае забеспячэнне, выкарыстоўваючы такія сучасныя вэбтэхналогіі, як PHP, JavaScript. Мы таксама выкарыстоўвалі сістэму кіравання змесцівам Drupal, якая дапамагла зрабіць вэб-арыентаваны інтэрфейс сістэмы і бібліятэкі для ўводу і вываду даных. Гэта трэба для стварэння рэтраспектыўнага аналізу інфармацыі. Для таго, каб разумець іх значэнне, пакуль на ўзроўні адлюстравання графікаў і суадносін вымяраных велічынь з іх гранічна допушчальнымі значэннямі. Гэта істотна павялічыла інфарматыўнасць», – падзяліўся Павел Шалькевіч.

Сістэма анлайн-маніторынгу стану навакольнага асяроддзя ў Оршы і Аршанскім раёне вымярае вялікую колькасць забруджвальнікаў паветра, глебы, паверхневых вод. З яе дапамогай можна даведацца, як зменшыць узровень утрымання шкодных рэчываў і ці трэба гэта рабіць. Такім чынам, сістэма стварае ўмовы для міжгаліновай камунікацыі. Як эколагі, так і біёлагі могуць выкарыстоўваць гэту распрацоўку для збору даных. Рэсурс падлучаны да Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь. Гэта цалкам афіцыйная крыніца.

На канферэнцыі таксама працавалі 4 секцыі: «Сацыяльна-экалагічныя і этыка-педагагічныя праблемы сучаснасці. Медыцынская экалогія»; «Праблемы сучаснай экалагічнай бяспекі (біяманіторынг, біяіндыкацыя, біярэабілітацыя, радыеэкалогія і радыяцыйная бяспека, экалагічны маніторынг, менеджмент і аўдыт»; «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў экалогіі, энергаэфектыўныя тэхналогіі)»; «Біяінфарматыка. Сучасныя падыходы і метады вывучэння біямалекул».

Правядзенне міжнародных навуковых канферэнцый у сферы экалогіі спрыяе дасягненню мэт у галіне ўстойлівага развіцця ААН.

Па словах экспертаў, устойлівае развіццё накіравана на задавальненне запатрабаванняў цяперашніх і будучых пакаленняў. Перш за ўсё гэта запатрабаванне ў прыродных рэсурсах. Калі мы хочам, каб у нашых дзяцей была магчымасць імі карыстацца, то павінны надаваць больш увагі ахове навакольнага асяроддзя і рацыянальнаму выкарыстанню прыродных рэсурсаў. Гэта значыць, з аднаго боку, неабходна зменшыць уздзеянне дзейнасці прамысловасці, транспарту і іншых галін гаспадаркі чалавека на прыроду, а з іншага – скараціць выкарыстанне прыродных кампанентаў ці паспрабаваць адрадзіць прыродазнаўчы кругазварот рэчываў у штучных экасістэмах. Таму з устойлівым развіццём наша дзейнасць звязана даволі цесна.

Па выніках працы канферэнцыі апублікаваны зборнік з 205 тэзісаў прадстаўленых дакладаў.

**Марыя Казлова**

## НАВІНЫ МІНСКА І БЕЛАРУСІ

• Прэзідыум НАН Беларусі падвёў вынікі конкурсу на суісканне прэмій для маладых вучоных Акадэміі навук за бягучы год. Лаўрэатамі сталі восем даследчыкаў.

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прысудзіў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва. Кіраўнік дзяржавы 19 снежня падпісаў адпаведныя ўказы.

• У Беларусі значна павялічаны максімальны памер прызавога фонду пры правядзенні латарэй.

• Мемарыяльны комплекс у Азарычах адкрылі пасля рэканструкцыі.

• Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 19 снежня падпісаў Указ № 399 пра прысуджэнне спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі «Беларускі спартыўны Алімп» 2023 года.

• Дадзены старт штогадовай рэспубліканскай інфармацыйнай кампаніі «Бяспечны новы год».

• Больш за 1300 заяў ад маладых наватараў паступіла для ўдзелу ў 13-м сезоне рэспубліканскага моладзевага праекта «100 ідэй для Беларусі».

• Беларускія нафтавікі датэрмінова выканалі гадавы план па асноўных напрамках.

• У БДТУ пакладзены пачатак распрацоўцы новых тэхналогій для айчынных дронаў.

• Дактары РНПЦ дзіцячай хірургіі правялі ўнікальную аперацыю немаўляці.

• Грамадскі транспарт Мінска ўпрыгожылі да навагодніх святаў. Таксама ў горадзе запалілі больш за 12 тысяч гірлянд.

• У цэнтры сталіцы разгарнуўся вялікі калядны кірмаш.

• Шматпрофільны культурна-спартыўны комплекс «Мінск-Арэна» адзначыў 15-гадовы юбілей.

• Крэатыўныя ёлкі ад кожнага раёна Мінска прадставілі каля Палаца спорту на выставе «Ёлкі нашага горада».

• Гадавы план па аднаўленні лясоў Мінскай вобласці перавыкананы амаль на траціну.

• У Мінску ўручылі прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі.

## Першы лёд самы каварны!

Зіма ўжо пануе, дзе-нідзе на сажалках і азёрах ужо з'яўляецца першы лёд, а разам з ім і першыя аматары зімовай рыбалкі. Ужо зафіксаваны першыя ахвяры тонкага лёду.

Многія людзі, выходзячы на лёд, нават не задумваюцца, што ён можа быць нетрывалым і вельмі небяспечным. Небяспечны ён не тым, што слізкі, а тым, што можа адабраць жыццё, расколоўшыся пад нагамі. Часцей за ўсё трагедыі адбываюцца ад бескласпотнасці і банальнага грэбавання правіламі бяспекі.

Каб з вамі і вашымі блізкімі не адбылася трагедыя, выратавальнікі нагадваюць:

- бяспечным для чалавека лічыцца лёд, таўшчыня якога не меншая за 7 сантыметраў;

- калі тэмпература паветра трымаецца вышэй за 0 градусаў больш за тры дні, то трываласць лёду памяншаецца на 25%;

- трываласць лёду можна вызначыць візуальна: лёд блакітнага колеру – трывалы, трываласць белага ў два разы меншая, шэры, матава-белы ці з жаўцізной – лёд небяспечны.

Калі вы праваліліся пад лёд:

- не панікуйце, не рабіце рэзкіх рухаў, стабілізуйце дыханне;

- раскіньце рукі ў бакі і паспрабуйце ўчапіцца за беражок лёду, надаўшы целу гарызантальнае становішча па напрамку плыні;

- паспрабуйце асцярожна налегчы грудзьмі на край лёду і закінуць адну, а потым і іншую нагу на лёд;

- калі лёд вытрымаў, перакочваючыся, павольна паўзіце да берага;

- паўзіце ў той бок, адкуль прыйшлі, бо лёд тут ужо правераны на трываласць.

Пры ўзнікненні надзвычайнай сітуацыі тэлефануйце 112! Беражыце сябе!

**Кастрычніцкі РАНС**

## Сустрэнем Новы год бяспечна!

Са святкаваннем Новага года звязана шмат традыцый: мы кожны год ставім і ўпрыгожваем ялінку, рыхтуем святочны стол і дорым адзін аднаму падарункі. Але з развіццём прагрэсу з'яўляюцца і новыя традыцыі. Так, мы ўжо не можам уявіць сабе ноч 1 студзеня без салютаў, феерверкаў і петард. Яны надаюць адмысловую атмасферу, людзі весяляцца, радуюцца, віншуюць адзін аднаго.

Але, на жаль, традыцыяй сталі і навагоднія пажары, звязаныя з выкарыстаннем піратэхнічных вырабаў. Прычынай пажару могуць стаць няправільная эксплуатацыя піратэхнікі, нізкі ўзровень якасці яе вырабу, незахаванне ўмоў захоўвання.

**МНС нагадвае:**

- не купляйце піратэхніку з рук (вы не можаце быць упэўнены ў якасці яе вырабу і ўмоў захоўвання), не дазваляйце карыстацца ёй дзецям да 18 гадоў, выконвайце ўсе патрабаванні інструкцыі па эксплуатацыі (звярніце ўвагу на тое, што для кожнага вырабу яна адрозніваецца);

- выкарыстанне дапускаецца толькі на адкрытых пляцоўках, удалечыні ад жылых дамоў і пабудоў. Прымяняць іх у дамах, у месцах масавага знаходжання людзей настойліва не рэкамендуецца.

Жадаем вам прыемна сустрэць Новы год!

**Маскоўскі РАНС**

Універсітэт
27 снежня 2023 года, № 12 (2277)

# Чэмпіёнскі ход: шашкі як частка жыцця

*«Няма нічога больш простага, чым вывучыць, як ходзяць шашкі; і няма нічога больш складанага, чым навучыцца гуляць у шашкі правільна»*

*Том Уісуэл*



На першым курсе факультэта міжнародных адносін БДУ вучыцца абсалютная чэмпіёнка свету! У свае 18 гадоў **Вікторыя Нікалаева** – уладальніца медалёў з чэмпіянатаў свету і Еўропы, міжнародны гросмайстар і ўдзельніца нацыянальнай зборнай Беларусі па шашках.

Займацца гэтым відам спорту Вікторыя пачала ў 5 гадоў. У юнацтве гуляў і бацька студэнткі, таму калі бацькі вырашылі аддаць дзяўчынку ў спорт, то выбралі менавіта шашкі. Можна сказаць, што гэта быў лёс.

Яе трэнерам стаў Віталь Аляксандравіч Аніська. У яго чэмпіёнка трэніруецца дагэтуль.

*– Калі мяне ўпершыню прывялі на заняткі, я не ведала асноў гульні. Не ўмела нават шашкі расстаўляць на дошцы. Хаця звычайна, калі дзяцей прыводзяць займацца, яны хоць нешта ведаюць. Але мяне сталі вучыць, і я хутка ўцягнулася. Паступова пачало атрымлівацца, стала цікава прыязджаць на трэніроўкі і даведвацца нешта новае, – успамінае Вікторыя.*

## Пра шашкі

Гісторыя гульні сыходзіць у глыбокую старажытнасць. Першыя звесткі пра шашкі датуюцца 1600 годам да н. э. і дайшлі да нас са Старажытнага Егіпта.

> ***У Сярэднявеччы шашкі лічыліся рыцарскай гульнёй, а валоданне ёй – адной з добрых рыцарскіх якасцяў.***

Наша гераіня любіць гульню за яе глыбіню. Сутнасць не толькі ў тым, каб рухаць шашкі па дошцы. За гэтым стаіць стратэгія, хітрыя ідэі, камбінацыі. Яна патрабуе логікі, аналізу, тактычнага бачання і здольнасці пралічваць наперад, як будзе хадзіць супернік, і падрыхтоўваць свае адказы на гэта.

*– Ёсць класічныя шашкі на дошцы ў 64 клеткі і «міжнародныя» на 100 клетак. Пралічыць хады ў апошніх складаней. Хаця ў класічных шашках я прадумваю свае дзеянні і суперніка нават на 15-20 хадоў наперад, – тлумачыць дзяўчына.*

Зараз міжнароднымі шашкамі чэмпіёнка займаецца з Ірынай Сямёнавай Пашкевіч – вядомай беларускай спартсменкай і прызнаным гросмайстрам сусветнага класа.

## Бліскучая кар'ера

*– У нас кажуць, што калі дзіця таленавітае, то ў яго медалі ідуць адразу. У мяне так і атрымалася. Ужо ў 7 гадоў я паехала на моладзевы чэмпіянат свету і ў катэгорыі да 10 гадоў заняла 4 месца. Тады я была адной з самых маленькіх удзельніц. Праз год на гэтым спаборніцтве я заняла 1 месца.*



Дзяўчынка хутка дабілася поспеху. У 11 гадоў Вікторыю дарослыя калегі нават сталі называць «Небяспечная Віка». Такую мянушку ёй далі ў 2016 годзе на этапе Кубка свету па шашках-64 у Санкт-Пецярбургу. Дзяўчынка змагалася супраць мужчын і жанчын у агульным і асобным заліку. Тады ў бліц-праграме сярод жанчын яна заняла першае месца.

*– Для ўсіх гэта стала нечаканасцю, таму што я была нашмат маладзейшай за астатніх. Памятаю, стаяла на ўзнагароджанні, а вакол дарослыя дзяўчаты на другім і трэцім месцах. Гэта выглядала даволі смешна, – усміхаецца гераіня.*

Пасля свайго першага буйнога спаборніцтва на моладзевыя чэмпіянаты Еўропы і свету Вікторыя пачала ездзіць кожны год. А ў 2019 годзе, калі ёй было 14, першы раз трапіла на дарослы чэмпіянат свету сярод жанчын, які праходзіў у Балгарыі. Там дзяўчына заняла 4 месца. У наступным годзе на чэмпіянаце Еўропы ў Эстоніі яна забрала серабро.

*– У дарослых спаборніцтвах можна ўдзельнічаць з любога ўзросту. У нас адбор адбываецца з першынства рэспублікі, прызёры адпраўляюцца на чэмпіянат Еўропы і свету.*

Дарослыя спаборніцтвы адрозніваюцца ад моладзевых сістэмай правядзення. У іх спачатку праходзіць папярэдні этап. А потым адабраныя ўдзельнікі гуляюць ужо ў плэй-оф.

> ***Любая жанчына можа гуляць на чэмпіянаце свету сярод мужчын, але мужчыны не могуць гуляць у жаночых.***

Вікторыя падзялілася невялікай хітрасцю:

*– Калі праходзіш папярэдні этап, ты знаходзішся на нейкай пазіцыі на табло. І за час фіналу ці спускаешся, ці паднімаешся па ім, у залежнасці ад тваіх вынікаў. Калі ты на верхняй пазіцыі, каб яе ўтрымаць, можна не толькі выйграваць, але і гуляць унічыю.*

Вікторыя ўдзельнічае і ў змешаных чэмпіянатах. Напрыклад, этапы Кубкаў свету, гасцявыя, у гонар якога-небудзь вядомага шашыста. Аматарскія турніры дзяўчына таксама не абыходзіць. Нядаўна, у верасні, ва ўніверсітэце праходзілі камандныя спаборніцтвы па шашках. У камандзе было па два чалавекі з універсітэта, каледжа і школы. Вікторыя ў іх таксама ўдзельнічала. Яе каманда заняла другое месца.

## Самыя яркія перамогі

Летась на чэмпіянаце свету ў Грузіі, у той момант яшчэ школьніца, Вікторыя заваявала 3 залатыя медалі з 3 магчымых. Стала найлепшай у хуткай, класічнай і бліц-праграмах. Яны адрозніваюцца па кантролі часу. Бліц – 3 хвіліны, хуткая – 7, класічная – 40. У тым спаборніцтве дзяўчына згуляла больш за 70 партый.

Перамогай у Грузіі Вікторыя ганарыцца больш за ўсё і прызнаецца, што і зараз не можа ў гэта паверыць. У гісторыі чэмпіянатаў сярод жанчын яшчэ не было такога, каб нехта заваёўваў адразу тры залатыя медалі.

А ў камандным чэмпіянаце свету, які прайшоў мінулым летам, Вікторыя са сваёй аднакаманднiцай Верай Хвашчынскай зарабілі 2 залатыя медалі з 2 магчымых.

Таксама ў гэтым годзе на чэмпіянаце Еўропы ў Турцыі дзяўчына заняла 1 месца ў класічнай праграме. А нядаўна, на моладзевым чэмпіянаце свету па шашках-64, стала сярэбраным прызёрам у хуткай праграме і бронзавым – у класічнай.

## Штодзённыя трэніроўкі

Да спаборніцтваў Вікторыя рыхтуецца старанна: распарадак дня, трэніровачныя турніры. Не забывае спартсменка і пра фізічную падрыхтоўку. На першы погляд у гульні ў шашкі няма нічога фізічна складанага. Але гэта толькі калі гуляць як аматар. На чэмпіянатах можа быць некалькі дзясяткаў партый за дзень, часам за дошкай можна прасядзець 5-6 гадзін. Для таго, каб падтрымліваць сябе ў форме, Вікторыя займаецца ў спартыўнай зале.

*– На спаборніцтвах за намі сочаць трэнеры, каб мы ў належны час клаліся спаць. Праўда, не заўсёды я рэжым выконваю. Я заўважыла за сабой такую асаблівасць, што калі своечасова кладуся спаць, у 10-11 вечара, і прачынаюся бадзёрай, то гуляю вельмі дрэнна. А калі пасплю 5-6 гадзін, разумею, што зусім не выспалася і засынаю за кожнай партыяй, то гуляю нашмат лепш, – дзеліцца дзяўчына.*

Чэмпіёнка лічыць, што, каб прафесійна гуляць у шашкі, не абавязкова мець прыроджаныя якасці. Галоўнае, каб чалавек быў уседлівым, здольным 3-4 гадзіны быць цалкам пагружаным у працэс. Патрэбная добрая канцэнтрацыя ўвагі.

*– Талент, несумненна, важны, але многія якасці, такія як памяць, логіку, увагу, можна развіць падчас трэніроўкі, – разважае дзяўчына. – Пачынаючы займацца шашкамі, адкрываеш у сабе самыя нечаканыя ўменні, напрыклад, здольнасць прытрымлівацца тайм-менеджменту. На чэмпіянатах час бывае вельмі абмежаваны, і, калі ты не навучышся яго карэктна размяркоўваць, перамог не чакай. Шашкі развіваюць многія якасці чалавека, таму, пры жаданні, лепш паспрабаваць пагуляць. Напрыклад, у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках праводзяцца адкрытыя ўрокі ў апошні аўторак месяца.*

## «Хваляванне трэба пакідаць за дошкай»

Важна развіваць у сабе стрэсаўстойлівасць. Вікторыя прызнаецца, што часта хвалюецца да таго, як садзіцца за дошку. Але, як толькі ўсе шашкі расстаўлены, а вочы суперніка аказваюцца насупраць, дзяўчына супакойваецца.

*– З'яўляецца адчуванне кантролю над сітуацыяй. Хоць і заўсёды нервуюся перад незнаёмым супернікам. Калі даўно ў спорце, ужо ведаеш, на што здольныя некаторыя калегі па дошцы. Калі толькі глядзіш на жараб'ёўку нават загадваеш, з кім бы хацеў згуляць, – успамінае студэнтка. – Яшчэ адзін хвалюючы момант бывае падчас партыі, калі ты разумееш, што пазіцыя выйгрышная і яе трэба захаваць да канца, каб не аддаць перамогу. У гэты момант нельга расслабляцца.*

Быць у нацыянальнай зборнай – гэта сапраўдная праца. У Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках Вікторыя працаўладкавана афіцыйна. Ёй, як чэмпіёнцы, апрача асноўнага заробку выплачваюць стыпендыю.

Цяпер у Вікторыі няпросты перыяд. Яна вучыцца на спецыяльнасці «міжнароднае права» і знаёміцца са сваім профілем. Дзяўчына прызнаецца, што ў БДУ вучыцца дастаткова складана і цікава. Чэмпіёнка яшчэ на першым курсе і толькі пачынае задумвацца, з чым жадае звязаць сваё далейшае жыццё. Але ад спартыўнай кар'еры адмаўляцца не плануе.

*– З часам цікавасці не становіцца менш. Хоць, бывае, ад колькасці трэніровак ці няўдалых спаборніцтваў можна перагарэць. Але ненадоўга. Я ўсё роўна вяртаюся да шашак, таму што ўжо не магу без іх. Гэта частка майго жыцця, – падагульняе Вікторыя.*

**Ганна Казакова**

# Пра Арыяну, Магію і Люціка

**Менавіта так магла б называцца казка паводле жыцця другакурсніцы факультэта міжнародных адносін БДУ Арыяны Чарняк. У 16 гадоў яна стала майстрам спорту і мае больш за 30 узнагарод рознай вартасці па конным спорце.**





Дзяўчына нарадзілася ў адзін дзень з мастакамі Франціскам Гоя і Вінцэнтам Ван Гогам і любіць, калі ў нефармальных зносінах яе называюць Арынай. Яна апісвае сябе як камунікабельнага, спагадлівага, добрага і шчырага чалавека. Яе дэвіз: «Стаўся да людзей так, як хочаш, каб яны ставіліся да цябе». Такія якасці, на думку студэнткі, павінны быць не толькі ў будучага дыпламата, але і ў любога чалавека наогул. Бо ўменне выбудоўваць адносіны, а тым больш міжнародныя – набыць заўсёды няпроста. Таму пры вывучэнні прадметаў сваёй спецыяльнасці яна імкнецца развіваць красамоўства, лагічнае мысленне, праектаваць сітуацыі, што вельмі важна для будучай прафесіі.

Напрамку «міжнародныя адносіны» пасля выпуску з гімназіі Арыяна аддала перавагу, пакінуўшы ўбаку такія варыянты, як «журналістыка» і «спартыўная псіхалогія». Студэнтка кажа, што шалі схілілі аповеды пра дыпламатычную дзейнасць бабулі і дзядулі. Яны па працы наведалі многія краіны.

## «Хачу займацца катаннем на конях»

Любоў да фізічнай актыўнасці бацькі другакурсніцы развівалі ў ёй з дзіцячых гадоў. Таму ў вольны час дзяўчынка наведвала розныя спартыўныя секцыі: займалася плаваннем, фігурным катаннем, вялікім тэнісам, горнымі лыжамі і нават рукапашным боем. Але нічога не западала ў душу – Арыяна не затрымлівалася там больш за год.

Як і большасць дзяцей, школьніца мела вялікую любоў да жывёл, асабліва да вялікіх, як коні. Сям'я Чарняк часта хадзіла ў заапарк і цырк, амаль кожныя выхадныя ездзіла за горад на конныя прагулкі. Тады Арыяна пазнаёмілася са сваёй першай кабылкай, на якой ездзіла, – яна была пяшчотна-крэмавай афарбоўкі і мела прыемную мянушку Магія.

У 12 гадоў студэнтка перарастала хадзіць на танцы і зразумела, што хоча, каб новае захапленне прыносіла задавальненне і было звязана з жывёламі. Дзяўчынка прыйшла да бацькоў і выпаліла: «Хачу займацца катаннем на конях» – тады малая не ведала, як гэта правільна называецца. Тата і маці спачатку не надалі гэтаму значэння: здавалася, што дачка проста аказалася пад уплывам моманту. Тады Арыяна агучыла сваё жаданне дзядулю – менавіта з ім упершыню трапіла на вялікую канюшню і пачала наведваць трэніроўкі. Дарэчы, Анатоль Віктаравіч таксама ўсё жыццё любіць здаровы лад жыцця і нават заснаваў уласны клуб па хакеі на траве. Таму сваё захапленне спортам у нейкай ступені другакурсніца лічыць і яго заслугай.

– Напачатку я трэніравалася ў прыватнай канюшні ў пасёлку Тарасава адзін-два разы на тыдзень – не разумела яшчэ, што існуюць прафесійныя трэніроўкі, – узгадвае дзяўчына. – Пазней мы даведаліся пра Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі ў Ратамцы, пра тое, што там праходзяць наборы ў навучальныя групы. Параіліся і вырашылі, што трэба паступаць. Каб трапіць туды, трэба было здаць нарматывы: бег, скачкі, кулькі, падцягванні і адцісканні. Вядома, увесь час я рыхтавалася. І, калі паступіла ў групу, шчасцю не было межаў. Там я займалася паўтара года, пасля чаго мяне заўважыў і забраў у прафесійнае аддзяленне выездкі мой першы трэнер. Гэта быў пачатак майго знаёмства са светам прафесійнага коннага спорту.

## Пра ідэалы ў спорце

Усведамленне таго, што спорт – аддушына, прыйшло да Арыяны, як толькі яна злавіла сябе на думцы, што не хоча спыняцца на дасягнутым і хоча развівацца ў сваім напрамку далей і больш. Дзяўчына заўважае: у конным спорце ёсць шмат вядомых і паспяховых спартсменаў – як замежных, так і беларускіх – на якіх можна раўняцца. Сярод іх – шматразовая пераможца і прызёр этапаў Кубкаў свету і дзесяціразовая чэмпіёнка Беларусі Ганна Карасёва. Таксама захапляюць яе і не такія тытулаваныя, але не менш таленавітыя спартсменкі – майстры міжнароднага класа Вераніка Ярашэвіч і Кацярына Яфрэмава. Яны таксама прадстаўляюць краіну на сусветных арэнах. Студэнтка называе вершніц сваімі кумірамі, захапляецца тым, што яны робяць, але сама хацела б выбудаваць уласны спартыўны шлях.

## Як Лейпцыг стаў Люцікам

Свайго каня Арыяна называе «баявым партнёрам», і нездарма. Перш чым стаць яго гаспадыняй, дзяўчына доўга ўзаемадзейнічала з іншымі.

– Вершнікам патрэбна ўмець знаходзіць кантакт з рознымі характарамі і тэмпераментамі коней, бо, як толькі трапляеш у прафесійную групу, кожную трэніроўку жывёлы мяняюцца. Мы трэніраваліся на кані, з якім павінны былі выступаць, толькі за некаторы час перад спаборніцтвамі. Так было два гады, пакуль мяне не пазнаёмілі з маім асноўным баявым партнёрам – Лейпцыгам. Ці, як я ласкава яго называю, Люцікам. Тады быў актыўны стартавы сезон: нас чакалі міжнародныя спаборніцтвы, таму мы доўга і шмат трэніраваліся. І этап скончыўся паспяхова: першае месца ў асабістым заліку, пятае каманднае і другое – у паказальным выступленні. Гэта дазволіла мне трапіць у юнацкую зборную і выканаць нарматыў майстра спорту. І, паколькі я апынулася ў зборнай, Люціка замацавалі за мной.

Конны спорт – адзін з нямногіх, дзе заўсёды ідзе парная работа. Коні як людзі, адчуваюць усе эмоцыі вершніка. Калі спартсмен нервуецца, то і «баявы партнёр» будзе несканцэнтраваным. Таму, каб пасябраваць з жывёлай, коннікі ствараюць даверныя адносіны. З конямі гэта можна рознымі спосабамі: з дапамогай размоў, частавання ласункамі, пагладжвання па пэўных месцах, выпуску ў спецыяльныя загоны – лявады. Вершнікі імкнуцца слухаць і паважаць сваіх партнёраў, якія добра адчуваюць падобныя адносіны. Так нараджаецца своеасаблівае сяброўства паміж канём і спартсменам.

Арыяна заўважае, што Люцік для яе – самы любімы і ласкавы, бо іх саюз доўжыцца ўжо тры гады. За гэты час студэнтка вывучыла ўсе звычкі каня. Напрыклад, Лейпцыг вельмі пераборлівы ў ежы: заўсёды разумее, што яму падкладваюць вітаміны, і абураецца. А яшчэ ён не любіць, калі яго чапаюць каля носа, але вельмі рады, калі чэшуць шыю. Яго гаспадыня кажа, што конь разумее інтанацыю яе слоў і заўсёды рэагуе на іх.

## Павага, разуменне і дысцыпліна на трэніроўках

Цэнтр, дзе займаюцца Арыяна і Лейпцыг, мае ўсё неабходнае абсталяванне для правядзення трэніровак. Дарэчы, у якім месцы яны праходзяць, у большасці выпадкаў залежыць ад надвор'я. У цёплы час спартсмены займаюцца на вулічных плацах. Тут спартсмены і коні прызвычайваюцца да любых прыродных умоў: на спаборніцтвах можна сутыкнуцца і з ветрам, і з дажджом. У перыяд халадоў трэніровачны працэс пераносіцца ў крытыя манежы.

Трэніроўка, падчас якой спартсмен знаходзіцца на кані, займае ад 30 хвілін да гадзіны, аднак пры гэтым улічваюць індывідуальныя патрэбы дуэта. Таксама коннікі для падтрымання формы займаюцца ў спартыўных залах. Акрамя таго, трэніровачны працэс уключае падрыхтоўку каня да выездкі, працэдуры, збор самога вершніка. У выніку спартсмены штодзень праводзяць у канюшнях 3-4 гадзіны. Калі ж вершнік займаецца з некалькімі «партнёрамі», то час можа расцягвацца.

Першы дарадца для спартсмена на трэніроўцы – настаўнік, які ўказвае на памылкі і дапамагае іх выпраўляць. Дарэчы, першым трэнерам Арыяны ў аддзяленні выездкі была майстар спорту Алена Мацiеўская. Менавіта яна стала для студэнткі праваднікам у свет прафесійнага спорту, навучыла азам дысцыпліны і правілам беражлівых адносін да коней. Зараз дзяўчына займаецца ў старэйшай групе з двума педагогамі – трэнерам вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Галінай Зотавай і старшым трэнерам нацыянальнай зборнай Святланай Еўшчык.

– Гэтыя людзі навучылі мяне вышэйшым элементам верхавой язды, далі зразумець, што без дысцыпліны ў нашым відзе спорту – ніяк. Яны сапраўдныя прафесіяналы, дзякуючы якім я дасягнула такіх спартыўных вышынь, – пераканана Арыяна. – Тры асноўныя пункты, на якіх грунтуюцца нашы адносіны з трэнерамі, – павага, разуменне і дысцыпліна.

## Пра перамогі і планы

Па словах дзяўчыны, рэспубліканскіх і міжнародных спаборніцтваў па конным спорце цяпер праводзіцца вельмі шмат. Асабліва насычанымі становяцца летні і вясенні сезоны, таму магчымасцяў набрацца стартавага вопыту ў пачаткоўцаў няма мала. Спартсмены выступаюць, як толькі азнаёмяцца з азамі. Хоць усе паказальныя заезды цяжка падлічыць, Арыяна помніць усе свае галоўныя старты:

– Калі я ўпершыню заняла прызавыя месцы на міжнародных спаборніцтвах, адчула вялікі гонар за сябе і каня. Менавіта ў такія моманты разумееш, што сілы затрачаныя не дарма. Да таго ж, гэта было першае выступленне з Люцікам. Незабыўнымі спаборніцтвамі сталі Еўразійскія гульні па выездцы 2022 года ў Маскве – гэта быў першы вопыт выступлення за мяжой. Там жа паралельна праводзіліся Еўрапейскія гульні па трохбор'і. Засталося шмат эмоцый, бо ўсёй камандай мы хадзілі на выступленні беларусаў, перажывалі. У выніку наша зборная заняла першае месца, а юнацкая, за якую выступала я з напарніцамі, – другое. Наступны старт – чэмпіянат рэспублікі ў Ратамцы. Там мы з Лейпцыгам і маім другім баявым партнёрам Гофманам сталі абсалютнымі чэмпіёнамі краіны ў юнацкай яздзе. Таксама былі этап Кубка Еўразіі, Еўразійскія гульні 2023 года. Хоць апошнія спаборніцтва стала для нас не самым удалым, мы вынеслі адтуль добрыя ўрокі.

Напрыканцы гутаркі дзяўчына прыадкрыла планы на спартыўную будучыню. Яна марыць стаць членам нацыянальнай каманды Беларусі па выездцы, прыняць удзел у чэмпіянатах Еўропы і свету, а таксама трапіць на адборачны турнір да Алімпійскіх гульняў 2028 года.

**Ірына ІВАШКА**
**Фота з архіва А. Чарняк**

УНІВЕРСІТЭТ
27 снежня 2023 года, № 12 (2277)

# З мастацтвам – за кубачкам чаю

**На факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ прайшоў дзявяты сезон праекта «Ноч на геа». Тэмай сёлетняй падзеі сталі «Адносіны з мастацтвам». Газета «Універсітэт» сабрала ўсё самае важнае пра студэнцкую ініцыятыву.**

Вытокі праекта пачынаюцца ў 2018 годзе. Тады актывісты захацелі прыўнесці ў жыццё факультэта новае нефармальнае мерапрыемства, якое б пашырала кругагляд удзельнікаў. Таму арганізатары спыніліся на фармаце вячэрняй сустрэчы, падчас якой з выступоўцамі можна весці дыялог. У першыя чатыры сезоны тэмамі «Ночы на геа» сталі «геаграфічныя» пытанні, а слухачамі былі прадстаўнікі ФГГ.

Яшчэ тады, рыхтуючыся да чайных паўз, студэнты задумаліся над праблемай засмечвання планеты пластыкам, таму ў паведамленні да мерапрыемства папярэдзілі, каб удзельнікі прыносілі з сабой шкляныя кубкі. Ідэя прыжылася, пасля чаго маладыя людзі вырашылі стварыць брэндавую прадукцыю праекта – кубкі з лагатыпам, значкі, шоперы, стыкеры. Гэта спрыяла таму, што сустрэчы сталі запамінальнымі, і пастаянныя ўдзельнікі сталі гаспадарамі «асаблівых» атрыбутаў «Ночы на геа».

У 2020 годзе аргкамітэт вырашыў разбавіць «геаграфічную» тэматыку агульнымі пытаннямі, а таксама запрасіць да сябе прадстаўнікоў іншых падраздзяленняў БДУ. З таго часу з двух сезонаў, якія праводзяцца за год, адзін прысвечаны папулярнай праблематыцы – бізнес-прадпрымальніцтву, псіхалогіі, медыцыне і інш.

Сёння ў камандзе праекта 12 чалавек. Кожны з арганізатараў мае свае абавязкі: нехта адказвае за прасоўванне сустрэч у сацыяльных сетках, нехта камунікуе з экспертамі і займаецца фірмовай прадукцыяй.

Па словах куратара «Ночы на геа» чацвёртакурсніцы Юліі Зіновік, тэма будучых сустрэч узнікае зусім нечакана. А вось да падбору лектараў падыходзяць вельмі скрупулёзна. На агульным сходзе арганізатары выбіраюць, каго можна прапанаваць у якасці выступоўцаў. Затым пошук кандыдатаў вядзецца сярод знаёмых, адсочваюцца цікавыя профілі ў Instagram. Калі выбар зроблены, адказны ад імя акаўнта праекта звязваецца з кандыдатамі, расказвае пра ініцыятыву і цікавіцца, ці будзе ім карыснае такое ўзаемадзеянне.

Сама Юля ўпершыню сутыкнулася з «Ноччу на геа», калі выбірала будучую спецыяльнасць. Дзяўчыну прывабіў фармат узаемадзеяння, а таксама незвычайная назва: няўжо студэнты сапраўды прыходзяць на факультэт ноччу, каб паслухаць цікавых людзей? А фотаздымкі з усмешкамі і мноствам кубкаў дапамаглі зразумець жаданне трапіць на праект нават тады, калі не атрымаецца паступіць.

– Сустрэча, на якую мне ўдалося завітаць, была прысвечана псіхалогіі. Яе ніколі не забуду. Гэта быў цудоўны дыялог з выступоўцамі, усе вакол былі вельмі кантактнымі, можна было задаваць любыя пытанні. А які ажыятаж! – узгадвае Юлія.

З мінулай восені дзяўчына сама стала кіраўніцай праекта. Студэнтка кажа, што першы куратар «Ночы на геа» магістрант Вікторыя Нікіфарэнка здолела перадаць новаму пакаленню арганізатараў любоў да праекта і паказала, што ў ініцыятывы ёсць патэнцыял і традыцыі, якія трэба падтрымліваць і працягваць.

Кожны раз удзельнікамі сустрэчы становяцца каля 100 чалавек. Геаграфія «Ночы» таксама самая розная (Ліцэй БДУ, журфак, ФФСН, МДЭІ імя А.Д.Сахарава, БДЭУ, БНТУ), хоць большая частка слухачоў – прадстаўнікі ФГГ. А звесткі пра ноч перадаюцца ад старэйшых курсаў малодшых, а таксама ад сяброў сябрам.



Юлія Лазоўская

– Складваецца ўражанне, што сустрэчы на праекце – як сямейны вечар у святочны дзень, калі ўсе збіраюцца пад адным дахам і ўсім ёсць чым падзяліцца, – заўважае Юлія Зіновік.

Куратара праекта падтрымлівае выпускнік факультэта і пастаянны ўдзельнік сустрэч Дзмітрый Каменеў:

– Падабаецца, што арганізатары падбіраюць актуальныя і цікавыя тэмы, што шмат зваротнай сувязі з аўдыторыяй. Выступоўцы кожны раз здзіўляюць: пастаянна не магу даўмецца, дзе толькі аргкамітэт іх знаходзіць. Тут заўсёды шмат незвычайных людзей! І, канешне, нельга не сказаць пра прыемную традыцыю – магчымасць папіць чаю з прысмакамі і абмеркаваць думкі са знаёмымі.

**Ад прафесіянала – студэнтам**

Лектарам дзявятага сезона «Ночы на геа» стала выпускніца Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў актрыса Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Юлія Лазоўская. Выступоўца шчыра падзялілася з гасцямі гісторыямі, што закранаюць гады вучобы, тэатральнае жыццё, навыкі акцёра і, канешне ж, адносіны з мастацтвам.

– Згадзіцеся, не так шмат фільмаў, над якімі вы можаце паплакаць. Гэта не зусім часта можна прымяніць да тэатра, паколькі спектакль – адлюстраванне нас саміх. Нядаўна я ў працэсе работы над пастановай «Карней» паводле Караткевіча зразумела, што ўспамінаю свой стары дом, дзе я ў маленстве жыла шмат гадоў. Ні разу не ўзгадвала, а тут – на табе! Гэта дзіўнае і невытлумачальнае пачуццё, калі ў табе нешта нараджаецца і прымушае задумвацца над тэмамі, за якія ты, магчыма, сам бы не ўзяўся, – пачала гутарку Юлія. – А яшчэ вы ніколі не ўбачыце адзін і той жа спектакль аднолькава: у ім пастаянна будзе нешта мяняцца, па-іншаму ўспрымацца, апускацца ці дадавацца.

Актрыса пераканана, што тэатр – гэта месца, якое выхоўвае. А артыстам, каб нарадзіць нейкае пачуццё ўнутры гледача, патрэбна найперш зрабіць гэта ў сабе.

**Бліц ад Юліі Лазоўскай:**

***Самыя папулярныя пытанні***

Ёсць база, якую агучваюць пры кожнай сустрэчы. Гэта тры топавыя пытанні: чаму я вырашыла стаць актрысай, ці ўмею плакаць і што мне больш блізкае: кіно ці тэатр.

Адказваючы на першае, скажу, што я доўгі час не ведала, кім збіраюся быць. Пасля ў 10 класе трапіла на спектакль і ўбачыла, што дарослыя людзі на сцэне паводзяць сябе як дзеці – дурэюць, скачуць. Адразу ж падумала: хачу гэтак жа ў любым узросце! І адразу кажу: «Мама, хачу быць актрысай!» Што датычыцца плачу, то плакаць я ўмею. Артыстаў вучаць мяняць эмоцыі для сцэны. З апошнім жа пытаннем не ўсё аднаназначна. З аднаго боку, бліжэйшы тэатр – бо там ідзе непасрэднае ўздзеянне на чытача, эмоцыі бываюць толькі аднойчы. З другога – кіно, бо заўсёды цікава назіраць за здымачным працэсам «знутры».

***Пра непаўторнае ў акцёрстве***

Плюс акцёрскай прафесіі ў тым, што ты пражываеш шмат жыццяў. Я люблю расказваць матулі, што «сёння я лісічка». Яна ў захапленні ад такіх гісторый, бо ведае, што, каб стаць рыжай жывёлкай, яе дачка вучылася ў ВНУ (смяецца). З раніцы ты іграеш у дзіцячым спектаклі, а ўвечары думаеш пра пастаноўку для дарослых. Так праца ідзе 24/7.

***Любімая роля***

У спектаклі «Пачупкі» ў нас ёсць частка «Чорнае на чорным». Яна цалкам вакальная, а я чалавек, які асабліва не спявае. Таму сваю ролю ў гэтай пастаноўцы люблю і недалюбліваю адначасова, паколькі цалкам адыграць яе мне не ўдалося ніводнага разу.

***Пераход з рускай мовы на беларускую***

Абсалютна няма ніякіх цяжкасцяў. На сцэне гаворыш па-беларуску, у жыцці – па-руску. А калі цяжкасці з успрыманнем ёсць у гледача, калі ён чагосьці не разумее, я раю схадзіць на тую ж пастаноўку яшчэ раз, каб нічога не згубіць. Паверце, галоўнае можна зразумець з кантэксту. У акадэміі ў нас нават быў эксперымент: мы глядзелі спектаклі на замежных мовах, каб лепш улавіць рэжысёрскі пасыл па жэстах, міміцы, рухах акцёраў.

***Прафесійная дэфармацыя***

Гэта калі-нікалі бывае. Напрыклад, я часта лаўлю сябе на тым, што размаўляю фразамі са спектакляў. Скажаш нешта – і адразу думаеш: а дзе гэта было? І пачынаеш успамінаць усе свае ролі. Падчас вучобы майстар курса заўсёды вучыў нас: як толькі выходзіце на паклон, вы ўжо не маеце ніякага дачынення да персанажа. Вы акцёр. І гэта правільна, бо два жыцці не павінны накладвацца адно на адно.

***Страх перад публікай***

Яго я дагэтуль не пераадолела. Кожны раз вельмі баюся, бо заўсёды выступаеш перад новым гледачом. Дарэчы, самыя строгія крытыкі – маладыя людзі, ад 15 да 30 гадоў. Да іх артысту патрэбна знайсці асаблівы падыход.

***Выкрыкі з залы***

Бываюць рэплікі, ад якіх становіцца вельмі смешна. І самае галоўнае ў такія моманты – тое, што трэба быць сур'ёзным і ніяк не рэагаваць.

***Адрозненні «свaёй» і «чужой» сцэны***

Вы маеце рацыю: сцэны абсалютна непадобныя. Аднагрупнік аднойчы правёў аналогію, што сцэна для яго – гэта дзяўчынка, з якой патрэбна пяшчотна камунікаваць і ніколі не абражаць. Родная зала для кожнага артыста менавіта такая. Адрозніваецца таксама і энергетыка беларускіх гледачоў і замежных. Наша публіка вельмі лаяльная, этычная, яна заўсёды цэніць працу акцёраў і ўдзячная ім.

***Падрыхтоўка ролі***

Вывучыць тэкст – самае малое, што робіць артыст. Далей ідзе разбор персанажа: чаму ён пайшоў у пэўнае месца, чаму зрабіў тое, што зрабіў... Тут нельга гаварыць: «А я б зрабіў па-іншаму!» Дзякуючы ролі, часта чытаеш і слухаеш творы, не блізкія табе ў звычайным жыцці. Акрамя таго, развучванне ролі – свайго роду псіхалогія. Разбіраючы свайго героя, акцёр разважае над сваім жыццём, прапрацоўвае рэальныя праблемныя сітуацыі.

– Не памылюся, калі скажу, што «Ноч на геа» займае месца ў сэрцы амаль кожнага на факультэце. Мерапрыемства моцна падыходзіць студэнтам, таму што аб'ядноўвае навукова-папулярныя лекцыі, нефармальную атмасферу і магчымасць убачыцца з сябрамі-выпускнікамі. Да таго ж, каштоўнасць праекта – веды, якія не заканчваюцца на нашай спецыяльнасці, – рэзюмаваў у канцы вечара ўдзельнік-чацвёртакурснік Андрэй Львоў.



**Ірына ІВАШКА**

# Крок наперад



YOUR MAJESTY — першае месца ў намінацыі «Найлепшы дуэт»

**Запальныя рухі, яркія вобразы і канцэптуальныя ідэі. На сцэне клуба RE:PUBLIC было горача, бо там сабраліся танцоры з самых розных навучальных устаноў Мінска.**

Да гэтага дня ўдзельнікі моладзевага танцавальнага фестывалю BSU Dance Festival рыхтаваліся некалькі тыдняў. Прыдумвалі выступленні, шылі касцюмы, штодзень праводзілі рэпетыцыі. Усяго ў фінале прынялі ўдзел 12 калектываў, 5 дуэтаў і 10 салістаў. Спаборніцтва праходзіла ў рамках акцыі «Творчая моладзь супраць СНІДу».

*– Раней да дня барацьбы са СНІДам мы ладзілі фестываль «Такія пернікі». Але час ішоў, і трэба было шукаць сучасны падыход. 5 гадоў таму мы вырашылі, што танцы – здаровы лад жыцця і яны як найлепш нам падыходзяць. Таму мы запусцілі фестываль, які б праходзіў не толькі ў рамках БДУ, але і ўсяго Мінска. Тут таксама іншыя ВНУ, каледжы. Фармат з сучаснымі танцамі і намінацыямі падабаецца моладзі, і колькасць гледачоў гэта пацвярджае. Зала поўная, – з гонарам дзеліцца загадчык культурна-масавага аддзела ўпраўлення па справах культуры Іван Жукаў. – Удзельнікаў таксама з кожным годам становіцца больш, і мы ўжо праводзім майстар-класы, дадаём асобныя намінацыі. 15 лістапада мы правялі кастынг, падчас якога выбралі фіналістаў. На адбор да нас прыйшло больш за 30 калектываў, 20 салістаў і каля 10 дуэтаў.*

Больш за палову каманд – з іншых універсітэтаў і каледжаў. Свае майстэрства паказалі прадстаўнікі з БНТУ, БДАТУ, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце РБ, Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Глінкі, Мінскага дзяржаўнага архітэктурна-будаўнічага каледжа, БДПУ імя М. Танка, Мінскага дзяржаўнага фінансава-эканамічнага каледжа і Мінскага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання.

Харэаграфічныя дуэты і калектывы прадстаўлялі танец, які найбольш яскрава адлюстроўвае характар, тэхніку і майстэрства каманды. Сольныя выканаўцы спаборнічалі паміж сабой у танцавальным батле. Яны дэманстравалі харэаграфію на 40-50 секунд пад выбраны твор, пасля чаго мяняліся музыкай з апанентам і імправізавалі. Да апошняга ніхто не ведаў, з кім яны будуць супернічаць, гэта вызначала лёсаванне.

Найлепшых выбіралі гледачы і журы. Суддзямі фестывалю выступілі: намеснік начальніка ўпраўлення па справах культуры, рэжысёр Аксана Чупрына, рэжысёр народнага студэнцкага музычна-драматычнага тэатр-студыі «На філфаку» Кацярына Тананайка, галоўны рэдактар радыёстанцыі «Радио ENERGY» Аляксей Клачкоў, мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі», уладальнік медаля Францыска Скарыны Ірына Грушава, саліст ансамбля Рыгор Кожух, харэограф і танцор El Gato Dance Center Анастасія Шылянкова, пераможца Lithuanian Cup 2019, Dance Power 2020, вечара шоўкейсаў «Твой выхад 2022», Street Style Challenge 2023 і заснавальнік танцавальнай каманды Mad Shameless crew KOVA, пераможца Lithuanian Cup 2019, Megadance 2020, прызёр чэмпіянатаў World of Dance Belarus 2021 і BOC 2020, выкладчык па girly hip-hop і choreo Наталля Белкіна, галоўны спецыяліст упраўлення па ідэалагічнай рабоце, культуры і па справах моладзі адміністрацыі Маскоўскага раёна Святлана Паўлава.


No frames — першае месца сярод танцавальных калектываў

Нават дасведчаным суддзям было нялёгка вылучыць з багацця яркіх выступленняў тройку пераможцаў. Першае месца сярод танцавальных калектываў заняла зборная каманда БДУ No frames. На другім месцы апынуўся калектыў БДУ Concept. А зборная юрфака Shel.by забрала трэцяе месца.

У гледачоў была магчымасць выбраць сваіх фаварытаў з дапамогай анлайн-галасавання адразу на мерапрыемстве. Прыз сімпатый гледачоў заваяваў танцавальны калектыў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта BNTU crew.

У намінацыі «Найлепшы дуэт» першае месца атрымалі другакурснікі гістарычнага факультэта Марыя Богдан і Эрдэмсайхан Уўганбаяр з ФМА YOUR MAJESTY. Другое месца заваяваў дуэт Дыяны Усаравай (ФМА) і Канстанціна Філіповіча (ФПМІ) з назвай We fell in love in October. Ім аддалі свае галасы і гледачы. На трэцім месцы – дуэт CALL ME студэнтаў хімічнага факультэта Кацярыны Кулеш і Цімура Саханкова.

Тройку найлепшых сольных выканаўцаў узначаліў першакурснік юрыдычнага факультэта БДУ Іван Осінаў. Юнак скарыў сэрцы прысутных яшчэ на выступленні ў складзе каманды Concept і стаў уладальнікам прыза сімпатый гледачоў і намінацыі «Самы энергічны сольны танцор». Другое месца заваяваў навучэнец Мінскага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання Уладзімір Коўган. «Бронзу» конкурсу ўручылі Эрдэмсайхану Уўганбаяру.

Каманды-пераможцы No frames і Concept трэніраваліся пад кіраўніцтвам студэнткі 2 курса біялагічнага факультэта Аляксандры Васілеўскай. У пачатку лета яе прызначылі куратарам танцавальнага напрамку ва ўпраўленні па справах культуры. Сама дзяўчына – былая гімнастка, заўсёды любіла танцаваць і змагла рэалізаваць сваё захапленне ва ўніверсітэце.

Для таго, каб набраць каманду, харэографы запрасілі ўдзельнікаў на кастынг. Іх папрасілі загадзя падрыхтаваць невялікія паказальныя выступленні, каб пагледзець на ўзровень і здольнасці.

*– Мы не глядзелі на пастаноўку танца, як чыста ён выкананы. Гэта важна, але ў той момант мы проста хацелі ўбачыць, з чым нам давядзецца працаваць. Прыемна разумець, што мы сабралі хлопцаў і дзяўчат амаль з усіх факультэтаў. У нас ёсць студэнты з хімфака, фізфака, біяфака, ФМА, эканамічнага факультэта, журфака, мехмата, ФПМІ і іншых, – адзначае харэограф.*

Каманда No frames падрыхтоўку пачала прыкладна з сярэдзіны жніўня. Разам з Аляксандрай студэнты рыхтаваліся да ўдзелу на «Віват, студэнт!». Было няпроста, бо большасць удзельнікаў каманды не з Мінска. Некаторым даводзілася штодзень ездзіць з іншых гарадоў для рэпетыцый або прыязджаць за некалькі гадзін да рэпетыцыі. Танец атрымаўся дынамічным, яркім. Для свайго выступлення студэнты спалучылі розныя стылі, эксперыментальную харэаграфію, хіп-хоп.

*– Мы з маёй калегай Ксеніяй Сухановай займаліся распрацоўкай танца ў любых умовах. У тым ліку перад люстэркам. Гэта ўсё адгаворкі, што для рэпетыцыі заўсёды патрэбная зала. Калі вялікая каманда, трэба ставіць малюнак танца, рэпеціраваць – вядома, зручна, але ўвесь матэрыял усё роўна даводзілася адпрацоўваць дома самастойна, – успамінае Аляксандра. – Удзельнікі абодвух калектываў за гэты час развіліся як танцоры. Вельмі прыемна назіраць за вынікамі.*

Выступіўшы на «Віват, студэнт!», каманда атрымала шмат станоўчых водгукаў. Таксама No frames паказалі свой нумар на гала-канцэрце фестывалю першакурснікаў YFM.

Каманда Concept, у адрозненне ад сваіх калегаў, зусім маладая. Яна сабралася ў пачатку лістапада. Танцуюць у камандзе ў асноўным першакурснікі. Па словах куратара, рэпетыцый было многа, асабліва перад адборачным і фінальным этапамі. Шмат часу пайшло на тое, каб не проста вывучыць рухі, а навучыцца працаваць на гледача, выклікаць у яго эмоцыі, уражваць, а часам нават палохаць.

Наперадзе ў танцавальных калектываў мноства планаў. Яны хочуць і далей развівацца ў сваім кірунку, трэніравацца і нават выязджаць на конкурсы і прадстаўляць універсітэт за межамі БДУ.

Акрамя пераможцаў фестывалю, некаторыя ўдзельнікі так здзівілі журы, што для іх вылучылі спецыяльныя намінацыі. Так, «Самы драйвовы нумар» у калектыву сучаснага танца OXYGEN БДАТУ. Гэтыя танцоры не першы раз скараюць сцэну БДУ. Летась госці з аграрнага ўніверсітэта забралі бронзу фестывалю і гран-пры сімпатый гледачоў.

Спецыяльны дыплом за «Самы артыстычны дуэт» заваявалі навучэнцы Мінскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Глінкі Маргарыта Валюшка і Рэната Трацэўская. А «Найлепшую імправізацыю» падчас батла паказала першакурсніца юрыдычнага факультэта Аліна Мішчук.

Арганізатары абяцаюць, што ў наступным годзе BSU Dance Festival пройдзе яшчэ больш маштабна!

**Ганна Казакова**

УНІВЕРСІТЭТ
27 снежня 2023 года, № 12 (2277)

# Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт аб’яўляе конкурс

## на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу

**Біялагічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры мікрабіялогіі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры батанікі | 1 год |
| Загадчык кафедры фізіялогіі чалавека і жывёл | 3 гады |
| Прафесар кафедры агульнай экалогіі і методыкі выкладання біялогіі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры батанікі | 1 год |
| Загадчык кафедры батанікі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры генетыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры генетыкі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры малекулярнай біялогіі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры клетачнай біялогіі і біяінжынерыі раслін | 3 гады |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Курчатава, 10, каб. 212, да 25 студзеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Курчатава, 10, каб. 212, да 24 лютага.

**Факультэт сацыякультурных камунікацый аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў [4] | 1 год |
| Загадчык кафедры дызайну моды [4] | 5 гадоў |
| Загадчык кафедры мастацтваў і асяроддзевага дызайну [4] | |
| Загадчык кафедры культуралогіі [4] | |
| Прафесар кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў [5] | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры мастацтваў і асяроддзевага дызайну [5] | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры камунікатыўнага дызайну [5] | |
| Дацэнт кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў [6] | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры інфармацыйных тэхналогій [6] | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры мастацтваў і асяроддзевага дызайну [6] | |
| Старшы выкладчык кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў [7] | |
| Старшы выкладчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў [7] | |
| Старшы выкладчык кафедры нямецкай мовы [9] | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры камп’ютарнай лінгвістыкі і лінгвадыдактыкі [10] | |
| Старшы выкладчык кафедры камунікатыўнага дызайну [10] | |
| Выкладчык кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў [8] | |
| Выкладчык кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў [8] | |
| Выкладчык кафедры мастацтваў і асяроддзевага дызайну [11] | |
| Выкладчык кафедры камунікатыўнага дызайну [11] | |
| Выкладчык кафедры тэорыі і практыкі перакладу [11] | |
| Выкладчык-стажор кафедры англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў [12] | |
| Выкладчык-стажор кафедры камунікатыўнага дызайну [13] | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Курчатава, 5, кабінет 208; да 25 студзеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Курчатава, 5, кабінет 409а; да 24 лютага.

**Гістарычны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры этналогіі,музеалогіі і гісторыі мастацтваў | 1 год |
| Загадчык кафедры гісторыі Расіі | 5 гадоў |
| Загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры гісторыі Расіі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры этналогіі, музеалогіі і гісторыі мастацтваў | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры гісторыі новага і найноўшага часу | 1 год |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: вул. Мендзялеева, 36, аўд. 103, да 25 студзеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: вул. Мендзялеева, 36, аўд. 306, да 24 лютага.

**Інстытут бізнесу БДУ аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Дацэнт кафедры бізнес-адміністравання | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры інавацыйнага кіравання | 3 гады |
| Старшы выкладчык кафедры фінансаў і менеджменту | |
| Старшы выкладчык кафедры бізнес-адміністравання | |

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 203, да 25 студзеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, каб. 213, да 24 лютага (дадаткова будзе паведамлена кандыдатам на пасаду).

**Хімічны факультэт БДУ аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Прафесар кафедры аналітычнай хіміі [2] | 2 гады |
| Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі | 3 гады |
| Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі | 1 год |
| Дацэнт кафедры аналітычнай хіміі | 2 гады |
| Дацэнт кафедры радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій | 1 год |
| Старшы выкладчык кафедры аналітычнай хіміі | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203, да 25 студзеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Ленінградская, 14, каб. 203, да 24 лютага.

**Факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры інфармацыйных сістэм кіравання | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры інфармацыйных сістэм кіравання | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры шматпрацэсарных сістэм і сетак | 1 год |
| Дацэнт кафедры вылічальнай матэматыкі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры вылічальнай матэматыкі | 1 год |
| Дацэнт кафедры тэорыі верагоднасцяў і матэматычнай статыстыкі | 5 гадоў |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе:
- дэканат факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (каб. № 509 галоўнага корпуса БДУ, пр. Незалежнасці, 4, г. Мінск), да 25 студзеня.

Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу:
- каб. № 518 галоўнага корпуса БДУ (пр. Незалежнасці, 4, г. Мінск);
- трэці аўторак пасля заявяршэння тэрміну падачы заяў, пачатак у 13:00, да 24 лютага.

**Філалагічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства | 3 гады |
| Загадчык кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства | 5 гадоў |
| Прафесар кафедры рускай літаратуры | 3 гады |
| Дацэнт кафедры кітайскай філалогіі | 1 год |
| Дацэнт кафедры замежнай літаратуры | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства | 3 гады |
| Дацэнт кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства | 3 гады |
| Дацэнт кафедры тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай | 2 гады |
| Дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры | 2 гады |
| Дацэнт кафедры рускай мовы | 3 гады |
| Дацэнт кафедры рускай літаратуры | 3 гады |
| Старшы выкладчык кафедры англійскага мовазнаўства [3] | |
| Выкладчык кафедры кітайскай філалогіі | |
| Выкладчык кафедры англійскага мовазнаўства | |
| Выкладчык кафедры нямецкага мовазнаўства | |

Месца (адрас) і тэрмін прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: вул. К. Маркса, 31, каб. 34, да 25 студзеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: вул. К. Маркса, 31, каб. 62, да 24 лютага.

**Фізічны факультэт аб’яўляе конкурс на замяшчэнне наступных пасад ПВС:**

| Найменне пасады і кафедры | Тэрмін абрання на пасаду[1] |
|---|---|
| Загадчык кафедры ядзернай фізікі | 5 гадоў |
| Дацэнт кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі | 5 гадоў |

Месца (адрас) прыёму заявы для ўдзелу ў конкурсе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 315, да 25 студзеня.
Месца (адрас) і дата правядзення конкурсу: г. Мінск, вул. Бабруйская, 5, каб. 326, да 24 лютага.

[1](дацэнт, прафесар, намеснік загадчыка агульнаўніверсітэцкай кафедры, загадчыка кафедры)

| Найменне пасады | Кваліфікацыйныя патрабаванні да пасады паводле АКДП і службовай інструкцыі |
|---|---|
| **Загадчык** | Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| | [4] Вышэйшая адукацыя, наяўнасць навуковай ступені доктара ці кандыдата навук, навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў. |
| **Прафесар** | [2] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, ці навуковае званне прафесара, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў. |
| | [5] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 7 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў. |
| **Дацэнт** | Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац і вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасад кіраўнікоў ці спецыялістаў, якія адпавядаюць напрамку адукацыйнай дзейнасці кафедры, не менш за 5 гадоў. |
| | [6] Вышэйшая адукацыя, навуковая ступень доктара ці кандыдата навук, наяўнасць навуковых прац ці вынаходстваў, патэнтаў, стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі кафедры, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў. |
| **Старшы выкладчык** | Кваліфікацыйныя патрабаванні. Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць вучонай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгоры «Кіраўнікі» або «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў. |
| | [3] Вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах педагагічных работнікаў, пасадах кіраўнікоў ці спецыялістаў, праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 3 гады. |
| | [7] Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў. |
| | [9] Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, нямецкай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў. |
| | [10] Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені), стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 3 гады або вышэйшая адукацыя і стаж працы на пасадах службоўцаў, якія адносяцца да катэгорыі «Кіраўнікі» ці «Спецыялісты», праца якіх адпавядае напрамку адукацыі, не менш за 5 гадоў; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў. |
| **Выкладчык** | Вышэйшая адукацыя па профілях «Педагогіка», «Педагогіка. Прафесійная адукацыя» ці вышэйшая адукацыя, якое адпавядае профілю выкладанага навучальнага прадмета (навучальнай дысцыпліны) і перападрыхтоўка па профілях «Педагогіка», «Педагогіка. Прафесійная адукацыя» без прад’яўлення патрабаванняў да стажу працы. |
| | [8] Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 1 года; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў. |
| | [11] Вышэйшая адукацыя і наяўнасць ступені магістра (вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай кваліфікацыі «Даследчык», вышэйшая адукацыя і наяўнасць навуковай ступені) і стаж працы на пасадах педагагічных, навуковых работнікаў не менш за 1 года; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў. |
| | [12] Вышэйшая адукацыя без прад’яўлення патрабаванняў да стажу працы; валоданне беларускай і рускай мовамі, англійскай мовай і, як правіла, іншай замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў. |
| | [13] Вышэйшая адукацыя без прад’яўлення патрабаванняў да стажу працы; валоданне беларускай і рускай мовамі, а таксама не менш чым адной замежнай мовай у аб’ёме, неабходным для выканання сваіх службовых абавязкаў. |

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 27.12.2023 г.
Зак. 1265. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

**Рэдактар** Уладзіслаў Уладзіміравіч ПАЛУКОШКА
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***